Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

БЕЛАРУСКІ ЗВОН

Радыкальная часапісь, выходзіць 4 разы ў месяц

Цана асобнага нумару 15 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі Вільня, Вострабрамская 9.

Прыймо інтэрэсантаў ад 10 да 2 г. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

ПАДПІСКА з дастаўкай да хаты: на 1 год 4 зл. 50, за паўгоду 2 зл. 40, за 3 месяцы 1 зл. 30, за 1 месяц — 50 гр.

Год II. Вільня, 23 ліпеня 1932 г. № 20 (45)

Ня падаць духам!

Апошнія падзеі на нашым школьным фроньце выклікалі сярод нашага грамадзянства ў Заходняй Беларусі стан *духовага прыгнечаньня.*

І нічога дзіўнага. Бо, калі за панаваньня ў „Сярэдняй Літве“ пана Мэйштовіча былі адным махам зьнішчаны ўсе беларускія пачатковыя школы — лікам каля 200, дык прынамся аставаліся нашыя прыватныя гімназіі, у якіх узгадоўваласе будучая беларуская інтэлігенцыя, будучыя сьведамыя барацьбіты за беларускую справу. Цяпер-жа справа йдзе аб зьліквідаваньні самастойнага беларускага школьніцтва наогул, і нет ведама чым яно будзе заменена. Дык зразумелая рэч, што кожын, хто ацэнівае, як сьлед, значэньне роднае школы для жыцьця нацыі, мусіць перажываць вельмі цяжкія, вельмі сумныя часіны.

Але, раўнуючы тое, што дзеялася ў нас дзесяць гадоў назад, з тым, што дзеецца сягоньня, сама сабой кідаецца ў вочы і пэўная глыбокая розьніца *дадатняга характару* ў палажэньні цяпер.

Тады беларуская школа, тварыўшаяся ў пачатку існаваньня „Сярэдняе Літвы“, была нечым новым, блізу нязьведаным яшчэ для народу, — бо-ж беларуская школьная сетка ў часох нямецкае акупацыі ў вельмі малой меры абыймала абшар пазьнейшае „Сярэдняе Літвы“. І беларускія масы, трацячы свае родныя школы, да якіх ня мелі навет часу прывыкнуць, часта не здавалі сабе справы з таго, што трацяць. — *Цяпер* масы, паспытаўшыя навуку ў роднай мове і навуку ў чужой, ужо сьвядома ацэніваюць вагу беларускае школы, а дзесяткі тысячаў школьных дэклярацыяў, падаваных у 1925-28 г.г. з дамаганьнем навукі ў роднай мове, найлепш сьцьвярджаюць *вялікі поступ у нацыянальнай сьвядомасьці беларускага сялянства.* — Дык і да ліквідацыі, якая можа пагражаць сягоньня самастойным беларускім гімназіям, маса падыходзе ўжо з іншай меркай, чым за часоў панаваньня п. Мэйштовіча.

Другое. *Тады* лічба інтэлігентаў-беларусаў была даволі абмежаная. Горш таго: тады пад беларускае імя падшываліся і такія „тоже белоруссы“, каторыя нічога супольнага з беларускай культурай і беларускай адраджэнска - вызвольнай ідэолёгіяй ня мелі. — *Цяпер* маем ужо шмат новых інтэлігенцкіх сіл, якія і сярэднюю эдукацыю атрымалі ў родных гімназ., і сталіся беларусамі ня толькі з імяньня, але і душой, і культурай, і мовай. І навет спыненьне існаваньня самастойнага беларускага сярэдняга школьніцтва ня можа ўжо спыніць росту нашае нацыянальнае інтэлігенцыі: бо навет тое бел. дзіцця, якое прымушана будзе вучыцца ў польскай дзяржаўнай школе, ня так лёгка будзе асымілявацца польскай стыхіяй, бачучы існаваньне беларускага арганізованага грамадзянства, нацыянальна-сьведамае інтэлігенцыі, беларусаў адвакатаў, дактароў, інжэнераў і г. д. Сягоньня ў нас ужо ёсьць больш магчымасьцяў змагацца з дэнацыяналізацыяй падрастаючага пакаленьня.

Урэшце, трэба адзначыць яшчэ адну праяву, якую ня ўсе бачаць, ня ўсе здольны ўявіць сабе.

Выбары ў Сойм 1922 году, даўшыя такую блікскучую перамогу беларусам (12 паслоў у Сойме і 3 у Сэнаце!), масавая дэклярацыйная акцыя на карысьць беларускае школы, грамадаўскі рух, які абхапіў да 100.000 партыйна з'арганізаваных сялян і работнікаў, — усе гэтыя масавыя выступленьні сьведчаць аб утоенай у нашым народзе *потэнцыяльнай сіле,* якая ў патрэбны мамэнт можа ператварацца ў *сілу дзейную.* Ці-ж хто можа паверыць, каб гэтая ўкрытая жывая народная сіла так, без дай прычыны, толькі ў выніку вонкавых уплываў, магла счэзнуць? Ды ніколі! Хто пільней прыглядаўся да нашага жыцьця, той ведае, што пасьля кожнага *прыліву* актыўнасьці беларускіх масаў наўхільна адбываецца *адліў* яе. І мы сягоньня перажываем гэтакі адліў, калі вонкавыя выяўленьні нацыянальнае актыўнасьці чэзнуць, калі душа народная як быццам хаваецца ў сваю шалупіну; але пройдзе крыху часу, блісьне мо' хоць на мамэнт і для нас ясны прамень сонца, — і беларуская народная маса ізноў падасьць свой голас, ізноў пакажа, што жыве, хоча жыць і будзе жыць. І ў такі мамэнт сіла наша будзе шмат большая, чым бывала раней, бо-ж нарасьлі новыя кадры нацыянальна сьведамае інтэлігенцыі, бо гэты працэс адбываецца на ўсіх землях падзеленае гранічнымі межамі Беларусі, бо там — за межамі — нарастаюць і новыя беларускія культурныя цэннасьці, якіх нам тутака так часта не хапае...

Вось, калі так разгледзім усе гэтыя мамэнты з перажытага і перажыванага беларускім народам, — дык навет самыя сумныя падзеі ў нашым нацыянальным жыцьці не павінны нас палохаць, не павінны забіваць веры ў будучыню. Цяжка сяньня, да болю цяжка і сумна, калі бачым наш унутраны развал, расьцярушаньне і марнаваньне нашых сіл. Але з гэтага застою народ беларускі мусіць выйсьці і — выйдзе. *Адліў* ужо канчаецца; *мусіць* пачацца *новы прыліў.*

Патрэба координацыі.

У апошнія гады ў Заходняй Беларусі культурная праца на вёсцы вельмі заняпала. Заняпала затым, што нашы цэнтральныя арганізацыі, якія гэтай працай раней кіравалі (Таварыства Беларускае Школы), дзеля „незалежных прычын“ пазбаўлены ўсякае магчымасьці працаваць, а другія, паўстаўшыя да жыцьця з канкурэнцыйнымі мэтамі, ня маючы ўжо з кім канкураваць, закінулі і тую абмежавую дзеяльнасьць, якую выяўлялі ў часе расцьвету Т. Б. Ш.

Аднак прыватная ініцыятыва ў гэтай галіне працы нашае ніколі не замірала і ня можа замерці. Гдзе толькі ёсьць жывы чалавек, у якога, незалежна ад яго „партыйнасьці“, б'ецца беларускае сэрца, там ёсьць і нейкая жывая работа. У адным месцы ладзяцца беларускія спэктаклі; у другім саматугам паўстае сьпявацкі гурток — бяз ніякага статуту й назову; у іншым — чалавек добрае волі вучыць дзяцей, прымушаных хадзіць у польскую школу, чытаньня й пісаньня ў роднай беларускай мове; яшчэ ў іншым — хтось мае некалькі дзесяткоў беларускіх кніжак, выпісвае беларускую газэту, і суседзі яго пазычаюць у яго кніжкі да чытаньня, прыходзяць даведацца, што тамака пішуць у газэце. А то бяруцца людзі за эканамічную ці гаспадарчую працу: закладаюць кооператыў, выпісваюць ускладчыну штучныя гнаі, лепшае насеньне, разводзяць пчолы і г. д. Мы часта атрымліваем інфармацыі аб гэткай працы, але пераважна з засьцярогай: „ня пішэце аб гэтым у газэце, бо баімося...“

Чаму „баімося“?

З аднаго боку — людзі баяцца, што зараз наскочаць усялякія „партыйцы“, якія будуць старацца наклеіць на гэткую чыста культурную працу свой партыйны „ярлык“, або, калі спаткаюцца з адпорам, пастараюцца справакаваць і „ўзарваць“ добрую ініцыятыву ідэйных адзінак. З другога боку—раз добры пачын ня ўняты ў пэўную юрыдычную форму і ня мае афіцыяльнага дазволу уладаў (— хоць на што ён тут патрэбен?), дык мяйсцовая адміністрацыя мае даволі фармальных падставаў, каб спыніць такую карысную культурную працу...

Як бачым, „конеьпірацыйнасьць“ тут даволі абаснованая. Але яна мае паважныя ад'емныя бакі. Перад усім — перад прыватнай ініцыятывай часта ўзьнімаюцца такія перашкоды, якіх не сустракае арганізацыя, маючая зацьверджаны ўладамі статут. Гэтак бывае, што адміністрацыя адмаўляе дазволу на ўладжаньне вечарыны, канцэрту, спэктаклю, калі просяць прыватныя асобы. Зараз узьнімаюцца падазронныя пытаньні: а на што пойдзе даход? Калі-ж ладзіцца нешта бясплатнае, падазрэньняў яшчэ больш... Другое — гэта немагчымасьць шырэйшае працы, тое, што чалавек добрае волі можа рабіці сярод невялічкае жмені сваіх прыяцеляў без арганізацыі ня можа абняць шырэйшаг грамадзянства, з якога маглі-б выбіцца йшч новыя актыўныя сілы. Урэшце, ня маюч сувязі з нейкім грамадзкім цэнтрам, такі культурныя партызаны ня маюць магчым сьці выкарыстаць тую дапамогу, якую мож даць арганізаванае грамадзянства, — ці дапамогу добрай радай, ці кніжкамі, ці пр сылкай лектара, ці іншым спосабам.

Пара нашым маладым культурным лам, якія нарасьлі за апошні дзесяток гад і, не ўваходзячы ні ў якія партыйныя арг нізацыі, астаюцца неяк збоку ад жыцьця, пара ім узяцца за работу і наладзіць св

цэнтр, каторы аб'яднаў бы і скоордынаваў усю гэную партызанцкую работу ў галіне пазашкольнае асьветы. Работа гэтая — нязвычайна ўдзячная і патрэбная. Яе неабходна вызваліць ад усялякіх партыйніцкіх мяркаваньняў і зрабіць тым, чым яна павінна быць: **будаваньнем беларускае нацыі.**

Аль.

Характэрная зьява.

Мы неаднакротна адзначалі, што дзяржаўная дапамога, якую атрымлівае ў Польшчы „рольніцтво", фактычна йдзе бадай выключна (прынамся на беларускіх землях) у кішэні паноў абшарнікаў. Абшарніцтва ў нас добра з'арганізавана і ўмее ўсё выкарыстываць для сябе, пад той час, як сялянства — „дробныя рольнікі" — зусім нез'арганізавана, расьцярушана і ня мае ніякае магчымасьці ходацца за сваё. У выніку гэтага ўсе дзяржаўныя дапамогі і крэдыты для „рольчіцтва" дастаюць тыя буйныя „рольнікі", якія ўмеюць іх браць.

Дык ня дзіва, што — пры сучасным агульным эканамічным крызісе — сялянства церпіць найбольш.

На гэту тэму ўжо навет „камні загукалі": навет абшарніцкая прэса (гл. „Слово" з 18 ліпня с. г.) піша аб катастрафічным палажэньні „дробных рольнікаў". Аўтар стацьці „Jeszcze jedno niebiezpieczeństwo" п. Левіцкі сцьвярджае, што ў выніку немагчымага палажэньня сялянства **гаспадар прымушаны папросту відаць працу на ральлі і эміграваць да места, шукаючы хлеба** (нядаўна падобныя весткі пачалі надыходзіць і з СССР). У Вільні нязвычайна шыбка расьце група безработных „нефаховых", да якіх, паводле слоў п. Левіцкага, і належаць гэтыя эміграны з вёскі.

І вось які канцавы вывад робіць з разважаньняў аб гэтым новым сумным зьявішчы аўтар успомненае стацьці:

„**Гэтак „голад зямлі" губляецца недзе паволі, а замест яго вырастае з крызісу абсурдная запраўднасьць „голаду на зямлі" — навет у гадох лішку ўраджаю**".

Вось у чым — паводле „Слова" — запраўдная катастрофа ў жыцьці вёскі. Сялянства, якое ад канца сусьветнае вайны і рэвалюцыі на Усходзе увесь час жыло лятуценьнем аб зямлі, у выніку таго, што зямлі не дастала, перастае ўжо думаць аб паляпшэньні сваей долі шляхам павялічэньня сваей жабрацкай гаспадаркі. Польскае абшарніцтва, якое спыніла правядзеньне зямельнае рэформы і не дало сялянам зямлі, якое — вуснамі свайго публіцыста п. Мацкевіча — называла йшчэ ўчора самую зямельную рэформу, хоць і ня зьдзейсьненую, „найвялікшай гаьбай", — раптам угледзіла, да чаго палітыка яго давяла. **Сялянства кідае зямлю, сялянства ўцякае з зямлі, сялянства губляе свой адвечны інстынкт уласьніка і пралетарызуецца.** Ці-ж гэта ня простая падгатоўка сялянства да... камуністычных колхозаў?

Абшарнікі раптам зразумелі, да чаго яны давялі сялянства, і б'юць на трывогу. Але нічога тут не памогуць ані спыняньне ў местах дапамогі „нефаховым" безработным, сярод якіх усё больш аказваецца гэткіх „беглых" сялян, ані — „паліцэйскія меры", да якіх абшарнікі заўсёды звярачаюцца, калі трэба зрабіць націск на вёску. З гэтага запраўды-ж абсурднага ставу, што вёска, вытвараючы хлеб, сама ня мае чаго есьці, ёсьць толькі адзін выхад: **даць вёсцы зямлю**, з якой абшарнікі справіцца ня могуць, даць не адкладаючы, зараз, сягоньня, бо заўтра можа быць ужо позна.

Ці зробяць гэты вывад самі абшарнікі? Ці гэтыя жывыя трупы ўступяць месца жывым народным сілам? Вось пытаньне першае вагі для ўсяе Польшчы.

Г. Б.

Новая „антанта" паміж Англіяй і Францыяй.

Калісьці „ўражаньне выбуху бомбы" зрабіў у часе (першай з бальшавіцкімі дэлегатамі) Гэнуэзскай канфэрэнцыі цішком падпісаны Рапальскі саюз паміж Нямеччынай і Радамі. Блізу такую-ж сэнсацыю выклікала ва ўсім палітычным сьвеце вестка аб заключэньні ў Лёзаньне новага „сэрдэчнага паразуменьня" („антанты") між Англіяй і Францыяй, падрыхтаванага старымі прыяцелямі: Эрыо і Мак-Дональдам.

Новы англійска-францускі „саюз" мае мэтай, як піша „Таймс", далейшае вырашэньне палітычных задачаў, якія парушаны былі на Лёзанскай канфэрэнцыі. Лёзанна абмежылася гаспадарчымі справамі, але эканамічная адбудова, ведама-ж, у вялікай меры залежыць ад палітычнай стабілізацыі, дык вось дзеля палітычнай стабілізацыі ў Эўропе і заключылі Эрыо з Мак-Дональдам „саюз".

У Францыі гэты паварот Мак-Дональда, які лічыўся хутчэй прыяцелем Нямеччыны, чым Францыі, выклікаў страшэннае захопленьне. У Англіі — значна меншае. У Нямеччыне, зразумела-ж, — папросту абурэньне проці Мак-Дональда за яго „здраду". Але найцікаўней, як адгукнулася на гэтае англа-францускае паразуменьне Амэрыка. Сам прэзыдэнт Гувэр, як толькі даведаўся аб гэтым „саюзе", напісаў ліст да сэнатара Бора, у якім піша:

Урад Амэрык. Штатаў ня быў паведамлены аб гэтым паразуменьні, дык папросту лічыцца з ім ня будзе... „Я не згаджуся ніколі, піша ён, каб на палітыку амэрыканскага народу рабіўся звонку націск. Таму і гэтае паразуменьне Англіі і Францыі ня ўплывае на нашу палітыку ніяк"...

Так рашуча, хаця даволі стрымана, піша сам галава амэрыканскага народу. Але амэрык. дэлегацыя ў Жэнэве, якую, як пішуць з Жэнэвы, вестка аб „англа-францускай бомбе" прывяла ў „стан запраўднага шаленства", выражаецца аб „эўрапэйскіх прыяцелях Амэрыкі" так „моцна", што ня можна перадаць на друкаванай паперы... Англію і Францыю вінаваціць у тым, што яны „зрабілі запраўдную змову проці Амэрыкі — як у справе ваенных даўгоў, таксама і ў справе разбраеньня, жадаючы сарваць цалком гуверавы праект разбраеньня, з аднаго боку, а з другога — адмовіцца ад ваенных даўгоў Амэрыцы", „дык — хай-жа спрабуюць"... ужо пагражаючы кажуць сябры амэрыканскай дэлегацыі.

Пагроза дзяржаўнага перавароту у Нямеччыне.

Дэкрэтам прэзыдэнта Гіндэнбурга канцлер Ф. Папэн назначаны камісарам Прусіі. Першым крокам яго было трэбаваньне, каб міністры аўтаномнага прускага Ураду, які займае апазыцыйнае становішча да цэнтральнага ўраду Нямеччыны з ф. Папэнам на чале, падаліся ў адстаўку. Дзеля таго, што ўрад Прусіі рашуча адмовіўся споўніць гэтае трэбаваньне, лічучы яго незаконным, паліцыя гвалтам заняла ўрадовыя гмахі і выдаліла стуль міністраў.

Проці гвалту над аўтаномным урадам Прусіі апошнім пададзена скарга да Дзяржаўнага Трыбуналу Нямеччыны. Адначасна падобная скарга пададзена ўрадам Бавары, і да яе мае далучыцца ўрад Вюртэмбэргу.

У Бэрліне скінуты з сваіх становішч рэзыдэнт паліцыі, яго заступнік і каэндант паліцыі. На іх месца назначаны аенны камэндант сталіцы генарал Рундтэдт, і такім чынам улада перайшла ў укі войска.

У Бэрліне зачынена камуністычная зэта „Ротэ Фанэ" („Чырвоны Сьцяг"). тлераўцы трэбуюць ліквідацыі камуністычнае партыі.

Адзначаны рад новых крывавых выцкаў. Сацыялісты і камуністы выступоць ўсё больш салідарна.

Проці апошніх крокаў ураду Ф. Папэна пратэстуюць і партыі цэнтру.

Крывавыя выбары ў Нямеччыне.

Выбарная кампанія ў Нямеччыне вяцца з такім шчодрым разьлівам братняй ві, што запраўды-ж больш падобная да хатняй вайны, як і пішуць усьцяж газэты. Што дня газэты зьмяшчаюць, як „выбарвую хроніку", даўжэнныя сьпіскі крывавых сутычак і ахвяраў — забітых і раненых — у баёх пераважна паміж гітлераўцамі і камуністамі або сацыялістамі. У зьвязку з завастрэньнем публічных баёў па ўсім краі міністар унутраных спраў апублікаваў адозву да насяленьня, заклікаючы яго, каб само не дапускала гэтых крывавых сутычак. Міністар прапануе усім адміністрацыйным уладам з найвялікшай асьцярожнасьцяй выдаваць дазволы на дэманстрацыі, асабліва войстра выступаючы проці асобаў, маючых агнястрэльнае аружжа. Адозва міністра вельмі добра прынята ўсімі партыямі, апроч хіба гітлераўцаў. З свайго боку аб'яднаныя прафэсіянальныя саюзы работнікаў (не сацыялістычныя) зьвярнуліся да Гіндэнбурга з тэлеграмай, дамагаючыся прыняцьця мераў, каб усьцішыць расшалелых дарэшты гітлераўцаў.

Надзеі і пляны Гітлера.

У Гітлера адбылося паседжаньне яго „галоўнага штабу". Радзіліся аб плянах далейшай дзейнасьці. Гітлер не сумляваецца, што яго партыя здабудзе больш мандатаў, чым якая іншая, але на большасьць у новым парляманьце не разьлічае. Таму пасьля выбараў яго партыя патрэбуе, каб Гіндэнбург даручыў яе фракцыі стварэньне ўраду. Канцлерам (прэм'ерам), мае быць выдатны гітлеравец Штрасэр. Але гітлераўскі ўрад створыцца толькі на тое, каб зараз-жа распусьціць парлямант дый вызначыць выбары... І вось гэтыя новыя выбары, якія будуць „зроблены" чыста гітлераўскім урадам, дадуць, як „не сумляваецца" ўжо Гітлер, рашучую пабеду яго партыі... Другім актам новага ўраду будзе назначэньне паўнаўладных „імперскіх камісараў" — ува ўсе саюзныя дзяржавы Нямецкай Рэспублікі, як Баварыя і інш., якія ня хочуць прызнаваць панаваньня гітлераўцаў...

Вялікая камуністычная дэманстрацыя ў Бэрліне.

У сувязі з чуткамі аб пастанове ўраду — пад націскам гітлераўцаў — абвясьціць нелегальнай і зьліквідаваць зусім камуністычную партыю ў Нямеччыне, у Бэрліне адбылася вялізарная дэманстрацыя камуністаў з учасьцем соцыял-дэмакратаў — пад лёзунгам: „Барацьба з фашызмам". Аратары заклікалі работніцкія масы да вострай барацьбы проці гітлераўцаў, ня спыняючыся перад агульнай забастоўкай у разе зачыненьня ком. партыі. Ніякіх сутычак ня было, — паліцыя, ўзброеная карабінамі, пільна сачыла за парадкам.

Але апошні бой між камуністамі і гітлераўцамі ў Альтоне, дзе трупам лягло 12 асоб, а раненых цяжка аж 55, змусіў урад урэшце паставіць рубам пытаньне аб ратаваньні краіны ад патапленьня ў крыві хатняе вайны.

Усе партыі, стоючыя на груньце Веймарскай канстытуцыі (шчыра рэспубліканскія), маюць зьвярнуцца да прэзыдэнта Гіндэнбурга з рашучым заклікам — прыняць меры проці падобных зьявішч. Але ўрад ужо й сам папярэдзіў гэты заклік, забараніўшы дэкрэтам усялякія маніфэстацыі і паходы на ўсей тэрыторыі рэспублікі.

Ходзяць навет чуткі, быццам урад мае увясьці ў краі „ваеннае палажэньне".

Перачытаўшы газэту — перадай другому.

Разбраенчая канфэрэнцыя у Жэнэве.

Разбраенчая канфэрэнцыя ў Жэнэве працуе з усіх сілаў над... слоўнай „формулай", якая-б, прымірыўшы ўсе страшэнна супярэчныя інтэрэсы і імкненьні вялікіх і невялікіх дзяржаваў, выявіла нейкую агульную і супольную волю ўсіх іх. Кажучы карацей, рэч ідзе аб нейкай агульнай рэзалюцыі, якая магла-б быць палажана, як падстава для далейшай працы.

Сярод эўрапэйскіх дзяржаўнікаў, аб'яднаўшыхся на груньце Лігі Нацыяў, ёсьць адзін такі непераможны мастак „злучаць нязлучальнае і гадзіць супярэчнае". Гэта—чэхаславацкі мін. п. Бэнэш. Яму, зразумела-ж, да таго-ж як старшыні „падрыхтаваўчай канфэрэнцыі", і была даручана цяжкая роля знайсьці такую цудоўную „формулу".

І вось, п. Бэнэш запраўды-ж неяк знайшоў гэткую „формулу", праўда, толькі... „адлажыўшы на пасьля ўсе палітычныя справы", ці супярэчнасьці.

„Формула" Бэнэша кажа аб абмежаньні ці забароне хімічнай і бактэрыолёгічнай вайны, танкаў, цяжкой артылерыі аб арганізацыі міжнароднага кантролю. Характэрна адсутнасьць у формуле забароны бамбардаваньня з самалётаў — асновы ўсяго панаваньня імпэрыялістычных дзяржаваў над „каляровым сьветам"...

„Памірыць" супярэчнасьці эўрапэйскіх дзяржаў п. Бэнэш неяк патрапіў: бо-ж — ня толькі Англія і Італія, але навет сама мілітарна наймацнейшая Францыя — прынялі, праўда, з значнымі засьцярогамі і папраўкамі (асабліва-ж — Францыя) формулу Бэнэша, як падставу для дыскусыі. Але проці яе гвалтоўна выступіла амэрыканская дэлегацыя. Амэрыканская делегацыя вінаваціць Англію і Францыю ў яўным жаданьні зьвясьці да нуля ўсю разбраенчую прапазыцыю Гувэра — аб зьмяншэньні на трацігу ўсіх збраеньняў. Як цьвердзіць амэрыканская прэса, Амэрыка пастанавіла не ўступаць, але наадварот — ужыць усю сваю сілу для рашучага націску на Эўропу.

Да лёсу „Лёзанны".

Патроху раскрываецца, які запраўдны зьмест і сэнс усіх так гучна разрэклямаваных пасьпехаў паразуменьня ў Лёзаньне. Адзін за адным яго ўчасьнікі і творцы, у выступленьнях пасьля канфэрэнцыі, тлумачаць зьмест „паразуменьня" так, што ад яго... блізу нічога не астаецца.

Зараз-жа пасьля „Лёзанны" нямецкі прэм'ер Папэн заявіў, што Нямеччына дабілася свайго: **адшкадаваньні скасаваны цалком і назаўсёды. Бо-ж гэтыя тры мільярды марак Нямеччына згадзілася ахвяраваць на гаспадарчую адбудову Эўропы, але зусім не былым саюзьнікам-пераможцам.** Таму гэтыя мільярды і аддадзены будуць (калі будуць...) не ім, але Банку Міжнародавых Разрахункаў у Базэлі...

Далей, уся Лёзанская ўмова толькі тады ўвойдзе ў сілу, калі яна будзе зацьверджана („ратыфікавана") парлямантамі. Але галоўныя дзяржавы-ўчасьнікі канфэрэнцыі зараз-жа заключылі між сабой „шляхотную ўмову", што ратыфікуюць лёзанскі дагавор толькі пасьля таго, як Амэрыка... вырашыць справу іх ваенных даўгоў... Такім чынам Амэрыка мае аплаціць блізу ўсе рахункі „Лёзанны"... Але, як мы бачылі, Амэрыка адказала вуснамі Гувэра зусім ясна...

Мала таго: толькі што сам Эрыо заявіў на рашучае запытаньне апазыцыі на апошнім паседжаньні парляманту, што „пастановы Лёзанскай канфэрэнцыі маюць... тымчасовы характар, узалежнены ад урэгуляваньня справы амэрыканскіх даўгоў"... Якведама, выходзячы з апошняга паседжаньня канфэрэнцыі і... цалуючы па чарзе немку і француску спасярод замежных карэспандэнтак у Лёзаньне ў знак сваей радасьці і поўнага паразуменьня Францыі з Нямеччынай, Эрыо казаў тады нешта іншае... Такім чынам „Лёзанна", як кажуць, „адцьвіла, не пасьпеўшы расцьвісьці"...

Дзіва, што й біржа, якая адразу на яе, як здавалася тады, памысны канец падняла высока ўсе паперы, цяпер, пасьля ўсіх гэтых „рэвалюцыяў" аб запраўдным зьмесьце і сэньсе „Лёзанны", пачала скідаць з гэнай вышыні блізу ўсе паперы — без ўсялякай літасьці...

У сваей апошняй заяве Эрыо падчыркнуў, што, калі ня будзе ратыфікавана „Лёзанна", дык— „аўтаматычна вяртаецца да жыцьця „плян Юнга"... Але ніхто ўжо не паверыць у тое, каб... сам п. Эрыо верыў у гэтыя свае словы. Калі што і пэўнае ў Лёзаньне, дык гэта — хаўтуры „пляну Юнга"... Але яны былі так сама пэўныя і... і без „Лёзанны"..

Новыя хмары на Далёкім Усходзе.

Як можна было спадзявацца, „мірнае паразуменьне" Японіі з Саветамі, якое так рэклямавалі ўсьцяж адзін за адным японскія дыплёматы, аказалася японскай „абяцанкай—цацанкай".

Як мы неаднойчы высьветлялі, Японіі трэба зьліквідаваць цалком расейскія сілы і ўплывы ў Манчжурыі, пакуль яшчэ расейскія ваенныя базы далёка ляжаць дый не падсунуліся да месца магчымых баёў у разе савецка-японскай вайны.

Мы высьветлялі ўжо нашым чытачом, як бальшавікі ў сьпешным парадку падсоўваюць гэтыя базы да Манчжурыі. Галоўная з іх ужо добра разбудавана бальшавікамі ў найбагацейшым у сьвеце вугальлем дый усялякімі мэталямі „Кузьнецкім басэйне", які ляжыць блізу на сярэдзіне Вялікага Сібірскага шляху, што скарачае ўдвая дастаўку ўсялякіх ваенных матэрыялаў на Далёкі Усход. У гэтым басэйне за два апошнія гады паўстала больш дзесятку ста-тысячных местаў, ці правільней: пакуль-што заводзкіх работніцкіх пасёлкаў, якія ў хуткім часе ператорацца ў запраўдныя вялікія гарады. Заводы і фабрыкі ў гэтым раёне пабудаваны з нябываным яшчэ нідзе на сьвеце размахам, але ўсё гэта яшчэ толькі ў працэсе будаваньня і будзе гатова толькі праз пару гадоў. А тады Саветы могуць зусім не баяцца Японіі ў Манчжурыі. Але ж ясна, што Японія ні за што ня будзе чакаць спакойна на сваю сьмерць у Манчжурыі, даўшы час дабудаваць бальшавікам гэтую валізарную ваенную базу ў Кузьнецкім раёне. Не такія-ж дурныя ўжо японцы... Таму, крыху ўсыпіўшы ўвагу бальшавікоў прамовамі сваіх дыплёматаў аб „вечнай прыязьні" з СССР, японцы раптам нанясьлі апошні і канчальны ўдар „стану валаданьня" бальшавікоў у Манчжурыі.

13 ліпая ўрад „незалежнай" Манчжурскай рэспублікі, пазываючыся на „ўсьцяж трываючую камуністычную прапаганду ўсіх радавых установаў на Усходня-Кітайскай чыгунцы", загадаў адным махам арыштаваць **усіх савецкіх урадоўцаў на гэтай чыгунцы.** Адначасна манчжурскія ўлады разам з японскімі вайсковымі часьцямі захапілі ўсе ўстановы і склады, ўсе маемасьці, належачыя да СССР на чыгунцы. Другі атрад захапіў радавы порт на рацэ Сунгарі разам з усім яго флётам, у ліку 6 параходаў, некалькіх дзесяткоў баржаў і г. д.

Адначасна манчжурскі ўрад абвясьціў афіцыяльна, што ўсе гэтыя захваты зроблены па яго загаду, дый што ніякія пратэсты радавых уладаў не памогуць нічога.

Такім чынам — Японія адным махам пазбавіла Маскву ўсіх пладоў яе бліскучай перамогі над Кітаем у радава-кітайскай вайне 1929 г.

Можна сабе ўцяміць лёгка, якая бура абурэньня паўстала ў Маскве. Урад зараз-жа заявіў пратэст праз свайго пасла ў Токіо. Японскі ўрад, зразумела-ж, закрыецца, як хвастом, „незалежнасьцяй" манчжурскага ўраду... Ці прыме такі „фігель" СССР спакойна, ці—наадварот — пачне вайну з Манчжурыяй, цяжка сказаць. Ясна адно: **„Японія, як заяўлялі не аднойчы яе міністры, не дапусьціць нікога ў Манчжурыю і нікому ня дасьць яе у крыўду"...** Дык вайна Радаў проці Манчжурыі зараз-жа ператворыцца ў вайну іх з Японіяй...

Ці пойдзе на гэтую рызыку бальшавіцкі ўрад, цяжка сказаць. Трэба думаць, што ня пойдзе. А тады Расея траціць блізу мільярдавы капітал, уложаны ёй калісьці ў Усходня-Кітайскую чыгунку, траціць карацейшы і выгаднейшы шлях у прыморскі край, траціць багаты гінтэрлянд для свайго порту ў Уладзівастоку...

У кожным разе чорныя хмары йзноў наплылі на небасхіл шматпакутнага Далёкага Усходу...

—.—

Апошнія тэлеграмы сцьвярджаюць, што пачаўся **і новы аружны канфлікт між Японіяй і Кітаем.**

Жыцьцё Польшчы.

Што дала Польшчы Лёзанская канфэрэнцыя.

Беручы справу з пункту гледжаньня фінансовага, Лёзанская канфэрэнцыя дала Польшчы ведамы плюс, але толькі на бліжэйшыя гады. Бо-ж па „пляну Юнга" Польшча атрымлівала ад Нямеччыны па 5 мільёнаў марак у год. Гэты даплыў грошы можа лічыцца блізу цалком спыненым. Але адначасна мараторыум для ваенных даўгоў пакідае польскаму скарбу 60 мільён. злотых, якія Польшча штогодна павінна была плаціць саюзьнікам. Такім чынам, калі будуць скасаваны ўсе ваенныя даўгі, дык Лёзанна будзе цалком карыснай для Польшчы. Але, калі пасьля канца мараторыя (прыпыненьня сплаты даўгоў) прыдзецца ізноў плаціць даўгі, разьвітаўшыся назаўсёды з адшкадаваньнямі, дык гэта, — ведама-ж, — будзе чысты мінус...

Дэкрэт аб новым угалоўным кодэксе.

15 ліпня апублікаваны новы Кодэкс Карны (Угалоўны статут) Польскай Рэспублікі, які ўведзены ў жыцьцё дэкрэтам п. Прэзыдэнта. Новы збор угалоўных законаў увойдзе ў сілу ад I верасьня гэтага году.

Беларусы у Латвіі.

Праца над беларускім фольклёрам.

„Беларускае Навукова-Краязнаўчае Т-ва ў Латвіі" ўжо зацьверджана і прыступае да працы. Новае Т-ва маніцца надрукаваць вынікі працы над беларускім фольклёрам, зробленае ў Латгаліі, бо якраз гэтых матэрыялаў не хапае ў беларускай навуковай літэратуры.

С. С. С. Р.

Канец сталінскага „Нэпа".

Цэнтральным Камітэтам СССР выданы новы дэкрэт, які фактычна касуе так званы „новы Нэп" Сталіна, ці вольны гандаль збожжам на рынках. Вольны гандаль, як ведама, шпарка падняў жывы гаспадарчы рух у СССР, зьнізіўшы цэны на збожжа.

Цяпер новы дэкрэт дазваляе выкідаць на рынак толькі лішкі збожжа, якія застануцца пасьля таго, як будуць аддадзены ўраду ўсе накладзеныя на хлебаробаў павіннасьці натурай — збожжам. Але пасьля гэтых „рэквізіцыяў" фактычна блізу нічога не астаецца навет для сябе на зіму. Дык збожжа блізу цалком зьнікла з „вольных" рынкаў. А гэта паставіла ў крытычнае палажэньне гарадзкі пралетарыят, бо-ж — у зьвязку з „сталінскім Нэп'ам"—былі зьліквідаваны „распределительные пункты" (дзеля выжываньня). У выніку гэтага гэтыя пункты

Такім чынам, спроба „буржуазнага“, але шпарка паднявшага дабрабыт у СССР вольнага гандлю, зьліквідавана цалком, як... немагчымая ў „пралетарскай дзяржаве“, у якой, як бачым, можна толькі... пухнуць з голаду.

З усяго сьвету.

Адстаўка Чэха-славацкага ўраду.

Габінэт Уджала падаўся у адстаўку, якая прынята прэзыдэнтам. Адстаўка выклікана апазыцыяй сэнацкай групы зямляўласьнікаў проці прэм'ера, які ўдадатку не знайшоў апоры ў сваей уласнай партыі.

Канфлікт паміж Англіяй і Ірляндыяй.

Востры канфлікт паміж Англіяй і Ірляндыяй, які пагражае хатняй, а мо' й запраўднай вайной, здавалася ўжо, узыйшоў на шлях злагоджаньня. Ірляндзкі прэм'ер дэ-Валера, правадыр ірляндзкіх рэспубліканцаў-незалежнікаў, які скасаваў навет фармальную прысягу англійскаму каралю, а таксама спыніў сплату „адшкадаваньняў“ былым англійскім лёрдам-абшарнікам за выкупленую ад іх зямлю (што й выклікала канфлікт), прыняў быў запрашаньне Мак-Дональда на асабістую нараду ў Лёндан. Але асабістае спатканьне абодвух прэм'ераў да паразуменьня не давяло. Мак Дональд трэбаваў, каб Ірляндыя заплаціла зараз-жа ў скарб Англіі паўтара мільёна фунтаў, як „залог“ будучага поўнага паразуменьня. Дэ-Валера адмовіўся, а на пагрозу забаравіць увоз у Англію прадуктаў ірляндзкай сельскай гаспадаркі, які дае значныя карысьці Ірляндыі, адказаў, што забаронівіць увоз у Ірляндыю англійскага вугальля. Пасьля гэтага абмену пагрозаў абодва прэм'еры разьехаліся ні з чым.

Сялянская рэвалюцыя ў Бразыліі.

У Бразыліі ўжо некалькі дзён ідзе крывавая хатняя вайна: там выбухла запраўдная сялянская рэвалюцыя. Справа ў тым, што паўдзённыя штаты Бразыліі, блізу чыста сельска-гаспадарскія, ўсьцяж былі трыманы „ў чорным целе“ паўночнымі прамысловымі штатамі, якія здолелі захапіць блізу цалком уладу дый стварыць для сябе ўпрывілеяванае жыцьцё—коштам працоўнага земляроба. Урэшце, зразумеўшы да канца сваю крыўду, працоўны селянін узяўся за аружжа, высунуўшы лёзунг аддзяленьня ад Бразыліі ўсей паўдзённай-земляробскай паловы краіны, як незалежнай дзяржавы...

Паўстанцы пачалі бурыць і руйнаваць усе шляхі камунікацыі паміж паўдзённай і паўночнай паловамі дзяржавы. Цэнтральны ўрад, зразумела, кінуў колькі мог войска проці паўстанцаў, зачыніўшы ды адрэзаўшы ад сьвету ўсе порты паўдзённай Бразыліі. Ае ўрадавыя войскі, дайшоўшы да паўстаўшых за свае кроўныя правы земляробаў, масова пераходзяць на іх бок. Паўстанчы ўрад вядзе рэвалюцыйную прапаганду па ўсім краі, карыстаючыся радыё.

Цэнтр паўстаньня — места Сан-Паўлё. Галава паўстанцаў—генарал Лёпэц, які трэбуе адстаўкі прэзыдэнта рэспублікі.

Апошняя вестка кажа, быццам Сан-Паўлё заняты ўрадавым войскам, але, калі гэта навет і праўда, дык гэта йшчэ зусім ня кажа аб хуткім зьліквідаваньні паўстаньня. Трэба думаць, што азброены гнеў сялянскіх масаў проці крыўднай палітыкі ўраду закончыцца кампрамісам: будуць зроблены ўступкі пакрыўджаным, а тады хутка дойдзе і да поўнага супакоеньня па прыродзе сваей мірнага сялянства.

Бацькі!

Навучайце дзяцей вашых чытаць і пісаць пабеларуску!

522-ыя угодкі Грюнвальдзкай бітвы.

Уся польская прэса прысьвячае 522-ім угодкам Грюнвальдзкай перамогі славянаў над немцамі (крыжакамі) гарачыя стацьці, радзячы ваяўніча настроенай проці Польшчы сучаснай Нямеччыне мець заўсёды ў памяці гэту мінуўшчыну. Слушна, напр., урадавая „Газ. Польс.“ піша, што ў памятным баі біліся поплеч рыцарства польскае і літоўскае (дадай: і беларускае), а галоўным камандзірам усей арміі быў князь Вітаўт, гістарычны герой як Польшчы, таксама і Літвы (дадай: і Беларусі). Няслушна толькі польскі офіцыёз, прыпамінаючы ўсё гэта немцам, забываецца сам аб беларускіх палкох, якія, як сьцьвярджае гісторыя, якраз і вырашылі лёс бою. Нажаль, паралель сучаснасьці з мінуўшчынай з пагляду на супольны фронт „ўсіх народаў, якія жывуць у вялікай тэрыторыяльнай калысцы — раўніне паміж Бальтыкай і Карпатамі“, выходзіць якраз не на карысьць сучаснасьці. Тады літоўскі князь быў адначасна „гістарычным героем Польшчы“, цяпер увесь літоўскі народ глядзіць у бок немцаў значна ласкавейшым вокам, чым у бок Польшчы. Тады беларускае рыцарства таксама білася разам. Цяпер тры чверці беларусаў адрэзаны ад Польшчы кордонам, а тая чверць, што асталася на гэты бок кордону ў Польшчы, як бачым хапя-б з самага артыкулу ўрадавай газэты, навет ня прымаецца ў разунак, як у адносінах да мінуўшчыны, так і цяпер.

Вывад — ясны, але вельмі сумны: супольны проці-нямецкі фронт „усіх народаў ад Балтыкі да Карпатаў“, які перамог тады немцаў, цяпер разьбіты — ў значнай меры дзякуючы палітыцы самае Польшчы... Таму— першым крокам польскай палітыкі, калі яна стаўляе сабе „грунвальдзкую задачу“, мусіла-б быць адбудаваньне гэтага супольнага фронту, прынамся ў межах самае Польшчы.

Трэба добра памятаць кіраўнікам сучаснай Польшчы, што кожная крыўда, якая робіцца ў Польшчы яе былым комбатантам пад Грюнвальдам, адбірае шансы ў новага супольнага фронту.

ХРОНІКА.

— **Няведамыя творы М. Багдановіча.** Пры разборцы архіву „Нашае Нівы“, які пераховаецца ў Беларускім Музэі ім. Ів. Луцкевіча, выкрыты некалькі пісем Максіма Багдановіча і орыгіналы ягоных вершаў. Сярод апошніх — два вершы нідзе не друкаваныя і не ўвайшоўшыя ў выданае ў Менску поўнае сабраньне твораў Багдановіча.

Гэтыя цэнныя матэрыялы апрацаваны ўжо грам. А. Луцкевічам і будуць апубліканы ў „Гадавіку“ Беларускага Навуковага Т-ва, які выйдзе ў сьвет увосені с. г.

— **Новы староста аб Віленска-Троцкім павеце.** Супрацоўнік „Слова“ меў гутарку з нованазначаным старостай Віленска-Троцкага павету п. Трэмэкурам — пасьля першага аб'езду ім павету. Уражаньні г. Старосты такія. Павет — усе яго гміны — мае мала даўгоў, раўнуючы з іншымі паветамі. Адна гміна — Рудамінская — мае навет у запасе 14.000 зл. гатоўкі. Але затое мала тут будуюць школ. У іншых паветах школьнае будаўніцтва стаіць шмат вышэй.

П. Староста адзначыў далей, што ў павеце залішне многа ёсьць войтаў з назначэньня, а ня з выбараў, што „не згаджаецца часта з воляй насяленьня“... У павеце замала... паліцыі: у некаторых гмінах адзін пастэрунак прыпадае ажно на 20 кв. кілёмэтраў... Трэба больш паліцыі.

Уканцы п. Староста заявіў, што ў часе свайго аб'езду павету ён завязаў „сэрдэчныя адносіны“ з „земяньствам“, духавенствам, вайсковасьцю, вучыцельствам і г. д. На жаль, п. Староста нічога ня кажа аб сваіх адносінах з галоўнай масай насяленьня — сялянствам... Чаму?

— **Надзорца работ — у мяшку.** Работнікі віленскае аўтабуснае фірмы „Арбон“ надовячы накінуліся на галоўнага надзорцу—швайцарца Глязэра і, узьдзеўшы яму на галаву мяшок, выкінулі з варштату.

Корэспондэнцыі.

Сёлетні ўраджай.

(Мілейчыцы, Бельскага пав.)

Сена ў нас сабралі сёлета вельмі добра. Азіміны ня так удаліся, бо было вільготна ў часе сяўбы. Ярына затое добрая. Калі хто меў чым працаваць на полі і што пасеяць, дык вынікі мае не благія. Але наагул на вёсцы — галіта. Грошы не пабачыш. Хлеб танны, і нат цяпер — перад новым — цэны йшчэ спалі, а купіць няма за што. Жывем бульбай.

А.

Будуйце лазьні!

Беларус па вушы гразьне,
Але ў вёсках Беларусі
Днём з агнём ніводнай лазьні
Не знашоў-бы нават мусіць.
Ад Барысава да Слуцку
(Аж прызнацца нек нялоўка!)
Ўсе прывыкі непалюдзку:
Сяк-так дзядзька плечы й грудзі
Папалам памые з Горам,
Але далей кажа: „будзе!“ —
Разьдзявацца, бачыш, сорам!
Нават людзі ёсьць такія,
Што другую палавіну
Ім хто-небудзь толькі мые,
Як кладуць у дамавіну.
Так як кветкі маладзіцы
Тут старачаюцца парою,
Але ніжэй паясьніцы
Абрасьлі, як ёсьць, карою...
Болей лазьняў, больш здароўя,
Гразь-жа нам нясе хваробу!
Дык збудуйце-ж!—клічу зноў я,—
Хоць адну на тую спробу.

Крапіва.

Зьмяшчаючы гэты сатырычны вершык беларускага поэты з Савецкае Беларусі (зб. „Асьцё“), адзначаем, што і нашых вяскоўцаў у Заходняй Беларусі ён павінен бы падбіць на большую ўвагу да чыстасьці — гэтае першае ўмовы здароўя людзей.

Як перасылаць грошы за газэту.

Гэтым паведамляем нашых падпісчыкаў, што яны могуць перасылаць належныя нам грошы за газэту гэтакім спосабам: 1) купіць на пошце блянк для пераказу на рахунак П. К. О., які каштуе толькі 5 гр., 2) запоўніць яго, як належа, упісаўшы адрас беларускае кнігарні Ул. Манкевіча (Księgarnia Białoruska Wł. Mankiewicza, Wilno, Ostrobramska I) і нумар конта 61991, 3) на адвароце часткі блянку „dla adresata“ напісаць: „За газэту“— і 4) бясплатна здаць разам з блянкам пасыланую суму на пошце.

Рэдактар-выдавец: М. СІНЯУСКІ. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая вул. 22